## НАУЧНАЯ ЖИЗНЬ

**С. Я. Новікаў**

# XV МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «БЕЛАРУСЬ І ГЕРМАНІЯ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ» У МДЛУ

8 красавіка 2016 г. у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце кафедрай гісторыі, сусветнай культуры і турызму і аддзелам ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі была праведзена XV міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць», удзельнікамі якой сталі амаль 50 гісторыкаў, у тым ліку даследчыкі з Германіі (Берлін), Польшчы (Гданьск), Расіі (Арэнбург, Волагда, Масква, Санкт–Пецярбург).

Адкрываючы канферэнцыю, прарэктар універсітэта А. М. Гарлатаў адзначыў, што гэта сустрэча праходзіць у адметны год у гісторыі Беларусі – 75-годдзе абароны Беларусі летам 1941 г. Абаронцам Айчыны прысвечана чарговая канферэнцыя, якая праводзіцца ва ўніверсітэце ў рамках выканання Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2016–2020 гг. «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» (навуковы кіраўнік – член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя). У рамках яе кафедра гісторыі, сусветнай культуры і турызму МДЛУ (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт С. Я. Новікаў) забяспечвае выкананне задання «Ваенная гісторыя Беларусі».

Напрыканцы прарэктар універсітэта выказаў у адрас удзельнікаў канферэнцыі спадзяванні на тое, што ў ходзе сустрэчы гісторыкі зробяць важны крок у напрамку ўзбагачэння айчыннай гістарыяграфіі новымі знаходкамі, цікавымі не толькі для шырокай навуковай грамадскасці, але і для студэнтаў нашай установы адукацыі.

Выступленні прайшлі ў рамках пленарных пасяджэнняў, абагульніўшых навуковыя даклады і паведамленні паводле трох праблемных палёў, сярод якіх: 1) «Змагацца, жыць і памятаць: погляд праз дзесяцігоддзі»; 2) «Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны: новыя факты, ацэнкі, высновы»; 3) «Беларуска-нямецкія адносіны ў люстэрку часу: мінулае і сучаснасць». У заключнай частцы сустрэчы адбылася прэзентацыя новых выданняў, падрыхтаваных кафедрай гісторыі, сусветнай культуры і турызму, якія выкарыстоўваюцца падчас вучэбнага працэсу на факультэтах універсітэта.

На пленарных пасяджэннях, якія адбываліся цягам усяго працоўнага дня ў Цэнтры беларускай мовы і культуры, ішла плённая дыскусія з удзелам як масцітых прафесіяналаў, так і пачынаючых даследчыкаў, аспірантаў і саіскальнікаў, тых, хто атрымаў важны практычны ўрок ў сферы распрацоўкі праблем беларускай ваенна-гістарычнай навукі. Фактычна кожнае пленарнае пасяджэнне ўяўляла сабой самастойную міні-канферэнцыю, у цэнтры якой знаходзілася гістарычная праблематыка розных навуковых напрамкаў.

У ходзе першага пасяджэння «Змагацца, жыць і памятаць: погляд праз дзесяцігоддзі» былі заслуханы навуковыя даклады айчынных і замежных даследчыкаў, у тым ліку: У. К. Коршука (Мінск), Ю. З. Кантар (Санкт-Пецярбург), К. Янеке (Берлін), А. В. Шаркова (Мінск), Д. Панцьё (Гданьск), а таксама паведамленні А. М. Літвіна (Мінск), І. М. Кузняцова (Мінск), У. В. Фядзюніна (Масква), І. З. Папова (Волагда), Р. Р. Хісамутдзінавай (Арэнбург).

Прадстаўленыя навуковыя матэрыялы і іх абмеркаванне яшчэ раз пераканалі ўдзельнікаў у тым, што баявыя падзеі, якія 75 гадоў таму мелі месца на тэрыторыі Беларусі, пастаянна трымаюцца ў фокусе навуковага дыскурсу і знаходзяць трывалае замацаванне ў сучаснай культуры памяці. Аб гэтым на дакументальных фактах і на ўласных успамінах усхвалявана дакладаў У. К. Коршук. У сваім дакладзе ён адзначыў, як важна працягваць справу па захаванні ў памяці не толькі гераічных, але і трагічных старонак гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі. Паважаны гісторык нагадаў, што менш за год таму ў Трасцянцы на дзяржаўным узроўні быў адкрыты Мемарыяльны комплекс «Трасцянец».

Даклад начальніка гісторыка-інфармацыйнай службы Дзяржаўнага Эрмітажа Ю. З. Кантар быў скіраваны на ваеннае паходжанне «рускіх» музейных і прыватных калекцый Фінляндыі, якія камплектаваліся ў гады вайны шляхам вывазу мастацкіх і этнаграфічных каштоўнасцей з тэрыторыі Карэліі. Даследчыца адзначыла, што гэта пытанне фактычна застаецца недаследаваным айчыннымі спецыялістамі, хоць актуальнай бачыцца задача па правядзенні сумесных расійска-фінляндскіх праектаў, накіраваных на вывучэнне карэльскіх культурных страт у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Праблему аднаўлення гістарычнай праўды працягнула супрацоўнік Германскага гістарычнага музея ў Берліне К. Янеке, якая звярнулася да новай музейнай тэмы, звязанай са 100-годдзем рэвалюцыі ў Расіі. Яна дала адказ на пытанне, чаму ў сённяшняй Германіі неабходна ўспамінаць тыя падзеі, якія так узрушылі ўвесь свет. На думку нямецкай даследчыцы, глыбокае веданне тых падзей неабходна цяперашняму грамадству, дзе пакуль застаюцца вострыя пытанні для дыскусій і тэматыка рэвалюцыйнай стыхіі ў пачатку мінулага стагоддзя цікавіць шырокае кола нямецкай аўдыторыі.

«Еўрапейскі кантэкст захавання памяці аб беларусах» – тэма даклада прафесара А. В. Шаркова, аднаго з аўтараў працы «Жить и помнить: Советские воинские захоронения в Европе» (кн. 1), адзначанай у пачатку года Культуры прэміяй Прэзідэнта Беларусі «За духоўнае адраджэнне». Заслугай прафесійнага ваеннага гісторыка з’яўлялася тое, што разам з супрацоўнікам галоўнай рэдакцыі міжнароднага вяшчання Беларускага радыё журналістам А. І. Харашэвіч яму удалося ў грунтоўным выданні ўваскрэсіць памяць пра савецкіх вайскоўцаў, у тым ліку беларусаў, якія загінулі і былі пахаваны на вайсковых могілках на тэрыторыі Германіі. У якасці падарунку аўтар пакінуў кнігу ў Цэнтры беларускай мовы і культуры.

Аб пошуку новых гарызонтаў памяці на прыкладзе музейнай экспазіцыі ў Гданьску дакладаў супрацоўнік музея Другой сусветнай вайны Д. Панцьё. З выкарыстаннем нагляднай інфармацыі ён паказаў, які шлях у апошнія гады прайшлі стваральнікі гэтага музея ад распрацоўкі навуковай канцэпцыі, пабудовы спецыяльна прыстасаванага для гэтых мэтаў будынка музея і стварэння экспазіцыі шляхам збору ўнікальных дакументальных матэрыялаў, у тым ліку з фондаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску.

Сярод паведамленняў першага пасяджэння выклікалі асаблівы інтарэс наступныя тэмы выступленняў: «Жывыя пасля расстрэлу: дакументальныя сведчанні з беларускіх турмаў 1941–1944 гг.» А. М. Літвіна, «Расстрэлы вязняў турмаў і лагераў НКУС БССР 22–30 чэрвеня 1941 г.» І. М. Кузняцова, «У цені Беластоцкай аперацыі: баі за заходні бераг Нёмана ад Гродна да Гожы» У. В. Фядзюніна, «Этапы кампенсацыі шкоды ад вайны ў гісторыі ФРГ» І. Д. Папова, «Пачатак Вялікай Айчыннай вайны ва ўспрыняцці грамадскасці Уралу» Р. Р. Хісамутдзінавай.

На другім пленарным пасяджэнні прагучалі даклады І. Ю. Варанковай (Мінск), Я. І. Бараноўскага (Мінск), В. Лукашуна (Гданьск), М. І. Стральца (Брэст), Э. Р. Іофе (Мінск) і А. А. Крыварота (Мінск).

Старшы навуковы супрацоўнік аддзела ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі І. Ю. Варанкова спынілася на гістарычных фактах, якія раскрылі дзяржаўны маштаб масавай абарончай работы, паказалі яе ролю ў ваеннай падрыхтоўцы грамадства і яго настроях у Беларускай ССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. Дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Я. І. Бараноўскі звярнуўся да пытання неабходнасці больш шырокага выкарыстання эпісталярнай спадчыны ўдзельнікаў Мінскага антыфашысцкага падполля, адзначыў яе важнае значэнне ў высвятленні асабліва заблытаных пытанняў у гісторыі падпольнай арганізацыі Мінска 1941–1944 гг. Вядучы супрацоўнік Музея гісторыі Другой сусветнай вайны ў Гданьску В. Лукашун спыніўся на маладаследаваных старонках гісторыі Халакосту ў Польшчы ў пачатку Другой сусветнай вайны, адзначыўшы пры гэтым, што менавіта польскія гарады і населеныя пункты сталі тым выпрабавальным палігонам, дзе ладзіліся першыя акцыі масавых забойстваў еўрапейскіх яўрэяў. Прафесар Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта М. В. Стралец працягнуў тэму Халакосту на прыкладзе паказу нацысцкай палітыкі вынішчэння ў дачыненні да беларускіх яўрэяў, што набыло асаблівае гучанне ў спецыяльнай літаратуры, дзе масавае знішчэнне яўрэйскага насельніцтва замацавана пад назвай Катастрофа. Прафесар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка Э. Р. Іофе звярнуўся да біяграфічных старонак жыцця нямецкага генерала Г. Гота – камандуючага 3-й танкавай групы, які летам 1941 г. забяспечваў выкананне баявых задач на паўночным напрамку наступлення групы армій «Цэнтр», адна з танкавых часцей якой ўдзельнічала ў захопе Мінска 28 чэрвеня 1941 г. Старшы навуковы супрацоўнік аддзела

ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі А. А. Крыварот спыніўся на аналізе фактаў узаемадзеяння партызанскіх фарміраванняў Беларусі і Украіны ў гады Вялікай Айчыннай вайны, разглядаючы іх у адлюстраванні сучасных навуковых напрацовак украінскай гістарыяграфіі.

У паведамленнях, заслуханых на другім пленарным пасяджэнні, звярталася ўвага на новыя дакументальныя знаходкі, гістарыяграфічныя факты і даследчыцкія ацэнкі малавядомых старонак гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У ходзе пасяджэння прагучалі паведамленні, якія закраналі наступную тэматыку: «Абарончыя баі Чырвонай арміі летам 1941 года ў найноўшых беларускіх, расійскіх і ўкраінскіх даследаваннях: параўнаўчы аналіз» (С. Я. Новікаў), «Аператыўна-службовая дзейнасць мясцовай паліцыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны: цяперашні погляд» (Я. А. Грэбень), «Беларускі штаб партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны (гістарыяграфія пытання)» (Д. А. Козел), «Школы і курсы па падрыхтоўцы паліцэйскіх і малодшага каманднага складу добраахвотных фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (С. В. Кулінок), «Фінансавая дзейнасць філіяла эмісійнага банку “Остланд” у Мінску (1941–1944)» (І. Я. Куракова), «Падрыхтоўка медыцынскіх кадраў на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў адлюстраванні айчыннай і замежнай гістарыяграфіі)» (Ю. У. Матусевіч), «Органы дзяржаўнай бяспекі ў падрыхтоўцы аперацыі па ліквідацыі гаўляйтэра Беларусі Вільгельма Кубе» (Н. А. Шыманская), «Інфармацыйна-даведачная база аб ваеннаслужачых і партызанах Беларусі, якія загінулі ці прапалі без вестак у гады Другой сусветнай вайны)» (В. А. Латышава, Д. М. Бузун), «62-і гвардзейскі авіяполк грамадзянскага паветранага флоту ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945)» (М. Б. Шчаўлінскі), «Нацыянальныя адносіны на тэрыторыі Беларусі ў дакументах польскага падполля (1941–1944 гг.)» (А. Г. Цымбал), «Фонды БШПР у НАРБе як крыніца па вывучэнні лёсу нямецкіх лётчыкаў і салдат, якія прапалі без вестак на тэрыторыі Беларусі (1941–1944)» (Д. І. Кіенка), «Вобразы вайны ў савецкай плакатнай графіцы» (В. В. Брыгадзіна).

У час правядзення трэцяга пленарнага пасяджэння былі заслуханы даклады і паведамленні, у якіх аўтары звярталіся да такіх важных аспектаў гісторыі, як беларуска-нямецкія ўзаемадачыненні, разглядаючы іх у люстэрку часу. Першымі выступілі з дакладам Я. М. Цішчанка і С. А. Сіткевіч на тэму «Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці аховы здароўя БССР у перадваеннае дзесяцігоддзе», у якім даследчыкі паказалі асноўныя вынікі дзейнасці ў гэтай сферы ва ўмовах пабудовы сацыялізму ў Беларускай ССР. Навукоўцы В. І. Білевіч і А. І. Білевіч у сваім дакладзе спыніліся на асобных малавядомых старонках гісторыі антысавецкай дзейнасці АУН-УПА, на аснове выкарыстання новых дакументальных матэрыялаў паказалі маштабы і праявы іх дзейнасці ў Брэсцкай і Пінскай абласцях у 1944–1953 гг. І. А. Літвіноўскі і Ю. І. Літвіноўская апрабавалі ў аўдыторыі вынікі даследавання тэрытарыяльнага пытання, якое датычылася беларускай мяжы ў раёне Брэста і пэўны час стаяла на парадку дня савецка-германскіх адносін напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны.

У паведамленнях, заслуханых падчас трэцяга пленарнага пасяджэння, даследчыкі закранալі розныя аспекты не толькі ваеннай гісторыі, але і іншыя пытанні найноўшай гісторыі Беларусі, у тым ліку палітыкі, эканомікі, культуры і г.д., якія былі адлюстраваны ў выступленнях А. М. Кушнярэвіча – «Нямецкія мастакі Гескія пры двары князёў Радзівілаў», В. П. Дзмітрыевай і У. У. Куніцкага – «Нацыянальная палітыка германскіх акупацыйных улад на тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны», В. Г. Мазца – «Некаторыя аспекты фінансавай палітыкі ўрада БНР у 1918 г.», Д. А. Мігуна – «Германска-беларускія адносіны ў другой палове 1918 г.», І. А. Саракавіка – «Беларуска-германскія навуковыя сувязі ў 1920-х – пачатку 1930-х гг.», Я. М. Сылкі – «Ваенна-гістарычная тэматыка як прадмет суразмоўя з немцамі», А. Г. Цымбала – «Працоўныя рэсурсы ў планах германскай акупацыйнай улады на Беларусі (1941–1944 гг.)».

Апошняй часткай працы канферэнцыі стала прэзентацыя новых выданняў, падрыхтаваных выкладчыкамі кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму за 2015 г. Новікаў С. Я. прадставіў 14-ы выпуск матэрыялаў канферэнцыі «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць». А. Г. Цымбал пазнаёміў удзельнікаў з 2-м выпраўленым і дапоўненым выданнем манаграфіі Новікава С. Я. «Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў».

У заключэнні былі падведзены вынікі канферэнцыі, удзельнікі якой адзначылі, што навуковае абмеркаванне гістарычнага феномена Вялікай Айчыннай вайны і звязанай з ёй шырокай даследчыцкай праблематыкі у фармаце пленарных пасяджэнняў, якія праводзяцца ў рамках штогадовай канферэнцыі, з'яўляецца адметнай формай вядзення сучаснага навуковага дыскурсу з удзелам даследчыкаў нашай краіны, краін СНД і далёкага замежжа. Актыўнае супрацоўніцтва архівістаў, гісторыкаў, музеязнаўцаў і іншых даследчыкаў у такім фармаце – трывалы падмурак для правядзення наступных сустрэч у Цэнтры беларускай мовы і культуры МДЛУ. Добрай прыкметай закладзенай шматгадовай традыцыі з'яўляецца таксама рэгулярнае выданне матэрыялаў міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць».